6. Dokumenty z historie československé politiky. 1939–1943 : 2 d. / Ed. by L. Otáhalová, M. Červinková – Praha : Akademie, 1966. – Díl 1. Vztahy mezinárodní diplomacie k politice československé emigrace na západě. – S. 1–412.
7. Моулис, В. Чехословакия и Советский Союз в 1945–1948 гг. / В. Моулис // Февраль 1948. Москва и Прага : взгляд через полвека. Материалы Второго заседания Комис. историков и архивистов России и Чехии, Москва, 26–30 апр. 1997 г. – М. : Ин-т. славяноведения и балканистики РАН, 1998. – С. 9–17.
8. Милякова, Л.Б. Элементы тоталитаризма в концепции экономического развития Чехословакии в 1945–1947 гг. / Л.Б. Милякова // Тоталитаризм. Исторический опыт Восточной Европы / редкол. : В.В. Марьина (отв. ред.), Ар. А. Улунян. – М. : Наука, 1995. – С.124–145.
9. РГАСПИ. – Фонд 17. – Оп. 128. – Д. 1083. Информационные материалы по стране.
10. ČSR a SSSR. 1945–1948. Dokumenty mezivládních jednáních / K. Kaplan, A. Špiritová (eds.). – Brno : Dolpněk, 1997. – 540 s.
11. Kaplan, K. Osudy Marshallova plánu v Československu : I / K. Kaplan, P. Přibík // Slezský sborník. – 1991. – №3–4. – S. 231–242.
12. Джилас, М. Лицо тоталитаризма / М. Джилас. – М. : Новости, 1992. – 544 с.
13. Орлик, И.И. Чехословацкий кризис в феврале 1948 г. и политика западных держав / И.И. Орлик // Февраль 1948. Москва и Прага : взгляд через полвека. Материалы Второго заседания Комис. историков и архивистов России и Чехии, Москва, 26–30 апр. 1997 г. – М. : Ин-т. славяноведения и балканистики РАН, 1998. – С. 99–107.
14. Prokš, P. Ekonomicko-politická rokování mezi Československem a Spojenými státy v letech 1945–1947 / P. Prokš // Slovanský přehled. – 1992 – Č. 78. – S. 11–21.
15. Beneš, E. Úvahy o slovanství. Hlavní problémy slovanske politiky / E. Beneš. – Praha : ČIN, 1947. – 371 s.
16. Kusin, V. Czechoslovakia / V. Kusin // Communist Power in Europe. 1944–1949 / Ed. by M. McCauley. – London : Macmillan, 1977. – P. 73–94.
17. Taborský E. Prezident Edvard Beneš and the Czechoslovak Crises of 1938 and 1948 / E. Taborský // Czechoslovakia : Crossroads and Crises, 1918–1988 / Ed. by N. Stone, E. Strouhal. – Houndmills and London : Macmillan, 1989. – P. 120–144.
18. Кратки, К. Кремлевский запрет: Чехословакия и «план Маршалла» / К. Кратки // У истоков «социалистического содружества»: СССР и восточноевропейские страны в 1944–1949 гг. / отв. ред. Л.Я. Гибианский. – М.: Наука, 1995. – С. 110–130.
19. Kaplan, K. Osudy Marshallova plánu v Československu : II / K. Kaplan, P. Přibík // Slezský sborník. – 1992. – №1 – S. 21–32.
20. Táborský, E. Prezident Beneš mezi Západem a Východem / E. Táborský. – Praha: Mladá fronta, 1993. – 328 s.

**Праневіч Дзмітрый Андрэевіч**

*Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь (Мінск, Беларусь)*

## ДЗМІТРЫЙ ФЁДАРАВІЧ ЖЫЛУНОВІЧ – СТАРШЫНЯ ПЕРШАГА ЎРАДА БЕЛАРУСКАЙ ССР

30 снежня 1918 г. у Смаленску праходзіла 6-ая Паўночна-Заходняя абласная партыйная канферэнцыя РКП(б), якая аб'явіла сябе Першым з'ездам Камуністычнай партыі бальшавікоў Беларусі. З'езд пастанавіў «прызнаць неабходным абвяшчэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі», акрэсліў яе тэрыторыю і зацвердзіў Часовы Рабоча-Сялянскі ўрад БССР.

У склад першага ўрада Беларускай ССР увайшлі прадстаўнікі Аблвыкамзаха і беларускія камуністы, якія працавалі на той час у Маскве. У склад Часовага Рабоча-Сялянскага ўрада ўваходзілі: ад групы беларускіх камуністаў – Д. Жылуновіч (старшыня ўрада), У. Фальскі (народны камісар замежных спраў), Ф. Шантыр (нацыянальных спраў), А. Чарвякоў (асветы), Я Дыла (працы), Д. Чарнушэвіч (сацыяльнага забеспячэння), І. Пузыроў (аховы здароў'я), А. Квачанюк (юстыцыі); ад Аблвыкамзаха – А. Мяснікоў (вайсковых спраў), Р. Пікель (саўнаргас), І. Рэйнгольд (фінансаў), М. Калмановіч (харчавання), А. Андрэеў (земляробства), С. Іваноў (унутраных спраў), К. Розенталь (пошты і тэлеграфа), І. Савіцкі (шляхоў зносін), С. Берсан (дзяржаўнага кантролю), В. Яркін (старшыня надзвычайнай камісіі (ЧК), Г. Найдзянкоў (старшыня калегіі па справах бежанцаў і палонных) [1, с. 40].

Юрыдычным канстытуцыйным актам, які абвясціў аб утварэнні БССР, быў Маніфест Часовага Рабоча-Сялянскага Савецкага Ўрада Беларусі ад 1 студзеня 1919 г. Падрыхтаваў тэкст Маніфеста старшыня ўрада Д. Жылуновіч яшчэ ў Маскве. Маніфест падпісалі Старшыня Часовага Ўрада Д. Жылуновіч, сябры ўрада: А. Мяснікоў, С. Іваноў, А. Чарвякоў, І. Рэйнгольд.

Беларускі Савецкі ўрад называўся «Часовым», бо ён быў створаны не беларускім народам, а наркомам па справах нацыянальнасцяў РСФСР І. Сталіным ад імя ЦК РКП(б). Калі Д. Жылуновіч прапанаваў унесці пэўныя змены ў склад урада, то І. Сталін накіраваў А. Мяснікову наступную тэлеграму: «Предложения Жилуновича о невключении трех членов нахожу дезорганизаторскими и в корне противоречащими решениям партии. Никаких особых решений группы Жилуновича не может быть. Список членов – всего 17 – является окончательным. Я требую от Жилуновича, его группы категорического ответа на вопросы, подчиняются ли они беспрекословно решению ЦК партии – Сталин» [2, с. 75]. З пункту гледжання канстытуцыйнага права такое ўтварэнне ўрада нельга, вядома ж, прызнаць законным.

5 студзеня 1919 г. Часовы Рабоча-Сялянскі ўрад Беларусі пераехаў са Смаленска ў Мінск і прыступіў да вельмі складанай працы па стварэнні дзяржаўнага апарата рэспублікі, аднаўленні эканомікі і наладжванні мірнага жыцця грамадства. 7 студзеня ўрад выдаў пастановы № 1 і № 2, у якіх юрыдычна замацоўваўся пераход улады ў губернях Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай і Смаленскай ад Аблвыкамзаха і Мінскага губрэўкама да Часовага ўрада і яго камісарыятаў. Адначасова абвяшчалася, што ўсе раней выдадзеныя ўрадам РСФСР дырэктывы, пастановы і распараджэнні, якія былі ажыццёўлены мясцовымі органамі Беларусі, застаюцца ў поўнай сіле. Аднак мірная праца была хутка парушана захопніцкімі дзеяннямі Польшчы з мэтаю аднаўлення Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Першачарговай задачай кіруючых колаў Польшчы з'яўлялася далучэнне Гродзенскай, Віленскай і Мінскай губерняў.

Улічваючы прэтэнзіі Польшчы на заходнюю частку Беларусі і Літву, ЦК РКП(б) па ініцыятыве У. І. Леніна 16 студзеня 1919 г. прыняў рашэнне перадаць у склад РСФСР тры губерні: Віцебскую, Смаленскую і Магілёўскую, а Мінскай і Гродзенскай губерням аб'яднацца з Літоўскай ССР у адно дзяржаўнае ўтварэнне – Літоўска-Беларускую ССР (ЛітБел). Галоўным матывам такога рашэння было стварэнне Літоўска-Беларускай дзяржавы, якая павінна была стаць буферам паміж Савецкай Расіяй і Польшчай, Буржуазным Захадам.

У мэтах хутчэйшага ажыццяўлення гэтых рашэнняў у Беларусь быў накіраваны ўпаўнаважаны ЦК РКП(б) А. Іофе. 16 студзеня 1919 г. адбыўся пленум ЦК РКП(б), на якім вырашалася пытанне аб выключэнні са складу тэрыторыі Беларускай ССР некалькіх губерняў. Афіцыйную пазіцыю маскоўскага кіраўніцтва па гэтым пытанні выклаў А. Іофе на пасяджэнні ЦБ КП(б)Б 22 студзеня 1919 г.: каб пазбегнуць уплыву «імперыялізму на Расію, ЦК вырашыў утварыць паміж ім і намі шэраг рэспублік-буфераў… На аснове гэтых меркаванняў ЦК пастанавіў утварыць Літоўскую і Беларускую рэспубліку» [3, с. 95].

Члены ЦБ КП(б)Б згадзіліся з пастановай ЦК РКП(б) аб адарванні ад БССР трох губерняў. Супраць выказаліся толькі паасобныя члены Цэнтральнага Бюро Кампартыі Беларусі. Прадстаўнікі Часовага ўрада БССР Д. Жылуновіч, А. Чарвякоў, А. Дыла, В. Фальскі, Ф. Шантыр, А. Квачанюк, І. Пузыроў накіравалі пісьмо прадстаўніку ЦК РКП(б) А. Іофе, а копіі пісьма – У. Леніну, Я. Свярдлову і І. Сталіну. Вынікам гэтага пісьма было толькі тое, што пры камплектаванні новага ўрада ССРБ у пачатку лютага 1919 г. усе ягоныя аўтары, за выключэннем І. Пузырова, не былі выбраны ў склад вялікага прэзідыума ЦВК БССР, які выконваў функцыі ўрада.

Старшыня першага ўрада Беларускай ССР Д. Жылуновіч на працягу ўсяго жыцця прапаведваў ідэі нацыянальна-вызваленчага руху. Ён паходзіў з сям’і беззямельных сялян. У 1905 г. Скончыў Копыльскае двухкласнае вучылішча. На працягу ўсяго жыцця займаўся самаадукацыяй. У 1904 г. уступіў у Капыльскую раённую арганізацыю Паўночна-Заходняга камітэта РСДРП, быў членам камітэта, кіраўніком культурна-асветніцкага аддзела. З 1913 г. у Пецярбургу уваходзіў у культурна-асветніцкія суполкі рабочых «Веды», «Адукацыя», міжраённую арганізацыю меншавікоў. Супрацоўнічаў з бальшавіцкімі газетамі «Правда», «Звезда», а таксама меншавіцкай «Луч». Зблізіўся з гуртком студэнттаў-беларусаў, наведваў «штаб» беларускага нацыянальнага руху ў Петраградзе – кватэру Б. Эпімах-Шыпілы. У 1916 г. працаваў у Беларускім бежанскім камітэце, пачаў выдаваць газету «Дзянніца». У пачатку 1917 г. уступіў у Беларускую сацыялістычную грамаду, адзін з лідэраў яе левай плыні. У сакавіку 1917 г. у Мінску на з’ездзе беларускіх нацыянальных арганізацый быў абраны ў Беларускі нацыянальны камітэт, у ліпені 1917 г., у Мінску на з’ездзе беларускіх арганізацый і партый – у Выканкам Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый. Удзельнічаў у Дэмакратычнай нарадзе 1917 г. у Петраградзе, на якой асудзіў нежаданне «расійскай дэмакратыі» даць народам сапраўдныя свабоды. У кастрычніку 1917 г. у Мінску на 3-м з’ездзе БСГ быў абраны членам ЦК партыі. У снежні 1917 г. у Мінску ўдзельнічаў ва Ўсебеларускім з’ездзе (кангрэсе), адмоўна ўспрыняў факт разгону яго бальшавікамі, што выказазаў на 3-м Усерасійскім з’ездзе Саветаў у студзені 1918 г. у Петраградзе. У лютым-снежні 1918 г. з’яўляўся галоўным сакратаром, загадчыкам выдавецкага аддзела Белнацкома пры Наркамнацы РСФСР, адначасова рэдактар яго органа газеты «Дзянніца» – першай савецкай газеты на беларускай мове. У кастрычніку 1918 г. Прэсненскі райком партыі Масквы прыняў яго ў РКП(б). Уваходзіў у кіраўніцтва Беларускіх секцый РКП(б). У 1919 – 1920 гг. – сакратар газеты «Красная звезда» (Харкаў), палітработнік у штабе 14-й арміі Паўднёвага фронту, потым літаратурны супрацоўнік у штабе Заходняга фронту ў Смаленску. З 1920 г. – сакратар, адказны сакратар газеты «Савецкая Беларусь», з 1921 г. у Мінску быў рэдактарам часопіса «Полымя», узначальваў Цэнтральны архіў БССР і Дзяржаўнае выдавецтва БССР, з’яўляўся членам прэзідыума Інбелкульта,

навуковым сакратаром камісіі па вывучэнні гісторыі рэвалюцыйнага руху ў Беларусі, працаваў намеснікам наркома асветы і старшынёй Галоўмастацтва БССР. У сакавіку 1922 г. накіроўваўся ў Берлін з мэтай выдання беларускіх падручнікаў і мастацкай літаратуры. У 1923 г. пленум ЦК КП(б)Б прыняў пастанову аб прысваенні Д. Жылуновічу звання народнага паэта Беларусі, аднак выканана пастанова не была. Удзельнічаў у працы Другой Усебеларускай канферэнцыі ў Берліне ў 1925 г. У 1934 г. быў прыняты ў Саюз пісьменнікаў БССР. У 1934–1936 гг. працаваў у Інстытуце гісторыі Беларусі Акадэміі навук БССР. Кандыдат у члены ЦК КП(б)Б у 1927 – 1929 гг., член ЦВК БССР у 1920 – 1931 гг. Ён з’яўляўся і акадэмікам АН Беларусі з 1928 г. [4, с. 382 – 383].

Палітычныя погляды Д. Жылуновіча на працягу жыцця неаднаразова мяняліся. Ён прайшоў шлях ад сацыял-дэмакрата леванародніцкага кірунку да нацыянал-бальшавіка. Да Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. аддаваў перавагу рэфармісцкім метадам, з дапамогай якіх імкнуўся дамагчыся беларускай дзяржаўнасці ў форме аўтаноміі ў складзе Расійскай дэмакратычнай рэспублікі. Пасля рэвалюцыі ва ўмовах нарастання сацыяльна-палітычнай барацьбы і нежадання Часовага ўрада сур’ёзна паставіцца да беларускага пытання погляды Д. Жылуновіча сталі больш радыкальнымі. Як паслядоўны дэмакрат з асцярогай успрыняў вестку пра Кастрычніцкае ўзброенае паўстанне 1917 г. у Петраградзе. Аднак, нягледзячы на ваганні, перайшоў на бок савецкай улады, прываблены яе сацыяльнай праграмай. Вырашэнне нацыянальна-дзяржаўнага пытання для Беларусі бачыў у набыцці ёй аўтаноміі ў складзе Савецкай Расіі.

Д. Жылуновіч даследаваў палітычную гісторыю Беларусі канца XIX – пачатку XX ст., пытанні развіцця рабочага руху з 1890 г. да пачатку рэвалюцыі 1905–1907 гг., дзейнасць розных партый і плыняў у рабочым асяроддзі, этапы фарміравання беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі з пачатку XIX ст., стратэгію і тактыку палітычных сіл у беларускім нацыянальна-вызваленчым руху, гістоорыю ўтварэння БССР.

У сярэдзіне 1920-х гг. у сувязі з абвінавачваннямі Д. Жылуновіча ў так званым нацыянал-дэмакратызме і неаднаразовымі выключэннямі з партыі ён дасылаў лісты ў ЦК і ЦКК КП(б)Б, ЦК ВКП(б), у якіх адмаўляў свой удзел у «Контррэвалюцыйных арганізацыях беларускіх нацыянал-дэмакратаў», прасіў «заставіць у партыі і паслаць на вытворчасць». 16 студзеня 1931 г. пастановай ЦКК КП(б)Б быў выключаны з партыі. 15 лістапада 1936 г. быў арыштаваны органамі НКУС. У Мінскай турме Д. Ф. Жылуновіча катавалі. 7 красавіка 1937 г. ён быў пераведзены ў Магілёўскую псіхіятрычную лячэбніцу, дзе, паводле афіцыйнай версіі, памёр ад гангрэны лёгкіх. Ёсць звесткі, што скончыў жыццё самагубствам. Беларуская грамадскасць неаднаразова ўзнімала пытанне аб рэабілітацыі Д. Жылуновіча (1955, 1956, 1958, 1969, 1087). 15 кастрычніка 1955 г. крымінальная справа па абвінавачванні Д. Жылуновіча пастановай Пракуратуры БССР была спынена за недаказанасцю складу злачынства. Поўнасцю Д. Жылуновіч быў рэабілітаваны 10 кастрычніка 1987 г., у КПСС адноўлены ў 1988 г. [4, с. 382 – 383].

Такім чынам, Д. Ф. Жылуновіч (Цішка Гартны) увайшоў у гісторыю як дзеяч беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, дзяржаўны і грамадскі дзеяч БССР, гісторык, публіцыст, пісьменнік. Ён удзельнічаў у стварэнні Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь, аўтар Маніфеста аб яе абвяшчэнні. З 1 студзеня 1919 г. да 2 лютага1919 г. з’яўляўся старшынёй Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Юхо, Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: у 2 ч. Ч. 2 / Я. А. Юхо. – Мінск: РІВШ БДУ, 2003. – 275 с.
2. Круталевич, В. А. История Беларуси: становление национальной державности / В. А. Круталевич. – Минск : Право и экономика. – 1999. – 385 с.
3. Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў у 10 т. / рэдкал. І. Антановіч (гал рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелНДІДАС, 1997. – Т. 1 : 1917 – 1922. – 398 с.
4. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1996. – Т. 3. Гімназіі – Кадэнцыя. – 527 с.



**Сальков Анатолий Петрович**

*Белорусский государственный университет (Минск, Беларусь)*


## «БЕЛОРУССКАЯ ЛИНИЯ» ЮГОСЛАВСКО-ИТАЛЬЯНСКОЙ ГРАНИЦЫ НА ПАРИЖСКОЙ МИРНОЙ КОНФЕРЕНЦИИ И СЕССИЯХ СМИД (1945–1949 гг.)

Триестинский кризис (1 мая – 9 июня 1945 г.), потрясший союзников по антигитлеровской коалиции, был вызван занятием югославскими войсками части спорного итало-югославского района Юлийской Крайны с полуостровом Истрия и городом-портом Триест, которые до войны принадлежали Италии [1; 2]. Однако еще накануне кризиса было выработано предварительное разграничение – линия раздела Юлийской Крайны по «соглашению Тито-Александер» от февраля 1945 г. (Триест и Горица под западным военным управлением с югославской гражданской властью) [3, с. 46–48].

Словенское освободительное движение целый век вело тщетную борьбу за Триест и выход к Адриатике, но не воспринимало национальных запросов итальянского населения Истрии [4]. В ходе Второй мировой войны это выразилось в итальянских погромах осенью 1943 г. и в мае 1945 г., учиненных югославскими партизанами в городах западного побережья Истрии [5, s. 50]. Югославы устроили в Триесте резню пленных немцев, итальянских полицейских и даже итальянских антифашистов, считавших, что Триест должен быть в составе Италии, с числом расстрелянных от 2 до 3,5 тыс. человек [6, с. 240; 7, p. 86]. Проблема fojbe (карстовые пещеры, в которые сбрасывались тела казненных) получила отражение в серьезной научной литературе [8; 9; 10].

Под сильнейшим нажимом западных лидеров, а также И. В. Сталина Югославия отвела свои войска и заключила с Англией и США Белградское соглашение 9 июня 1945 г., восстановившее статус-кво «соглашения Тито-Александер». Документом от 20 июля была определена линия демаркации («линия Моргана», по имени начальник штаба союзных войск в Италии). Она делила Юлийскую Крайну на две зоны – зону «А» (северо-западная часть края с Триестом), оккупированную англо-американскими частями и зону «Б» – (остальная, большая часть края), контролируемую войсками Югославии [11, s. 368–371; 12, p. 327–348]. Окончательное решение проблемы было отложено.

Конфликт в Юлийской Крайне вступил в новую фазу на I (Лондонской) сессии Совета министров иностранных дел великих держав (СМИД, 11 сентября – 2 октября 1945 г.), где началась выработка мирного договора с Италией. Были внесены четыре его проекта. Британский, американский и